


# З ВЯЛІКІМ СВЯТАМ,

## З НОВЫМ ГОДАМ, ДАРАГІЯ ТАВАРЫШЫ!

У новым росквіце сіл сустракае наша Радзіма новы, 1969 год. Поспехі савецкага народа ў выкананні рашэнняў XXIII з'езда партыі і пастаноў Пленумаў ЦК КПСС яскрава сведчаць аб паслядоўным і мэтанакіраваным руху нашага грамадства да камунізма.

Для Беларусі гэтае свята асабліва радаснае. У першы дзень Новага года мы адзначаем два слаўныя юбілеі — 50-годдзе БССР і 50-годдзе Кампартыі Беларусі. За паўвека наша рэспубліка, на сцягу якой ззяюць два ордэны Леніна, пад кіраўніцтвам Камуністычнай партыі ператварылася ў высакаразвітую сацыялістычную дзяржаву—рэспубліку першакласнага машынабудавання, вялікай хіміі і нафты, электронікі і прыборабудавання, магутнай сельскай гаспадаркі, перадавой сацыялістычнай навукі і культуры. У гэтых перамогах ёсць значная доля і нашага калектыву. У азнаменаванне заслуг у падрыхтоўцы высокакваліфікаваных спецыялістаў і ў навуковых даследаваннях, улічваючы вялікі ўклад у камуністычнае будаўніцтва і выкананне сацыялістычных абавязацельстваў у гонар 50-годдзя БССР і Кампартыі Беларусі, наш ардэнаносны універсітэт узнагароджан памятным сцягам ЦК КПБ, Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР, Савета Міністраў БССР і Белсаўпрофа. Памятны сцяг перададзен нам на вечнае захаванне.

Сардэчна віншуем студэнтаў, аспірантаў, прафесарска-выкладчыцкі састаў, рабочых і служачых універсітэта з вялікім нацыянальным святам беларускага народа — 50-годдзем БССР і Кампартыі Беларусі, жадаем усім моцнага здароўя, новых поспехаў у працы і вучобе, заклікаем калектыў і далей развіваць навуковыя даследаванні, працягваць плённую работу па ўдасканаленню падрыхтоўкі высокакваліфікаваных кадраў, каб дастойна сустрэць 100-годдзе з дня нараджэння У. І. Леніна!

РЭКТАРАТ    КАМІТЭТ КАМСАМОЛА    МЯСЦКОМ
ПАРТКОМ    ПРАФКОМ

ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ГОД ВЫДАННЯ XXII
27 снежня 1968 г. ПЯТНІЦА
№ 38 (729)
ЦАНА 2 КАП.

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

# ФЛАГМАН

## БЕЛАРУСКАЙ НАВУКІ ЗАЎЖДЫ ГАТОЎ ВЫКАНАЦЬ ЛЮБОЕ ЗАДАННЕ ПАРТЫІ І НАРОДА

**У гэты вечар нельга было знайсці свабоднае месца ў актавай зале. Сюды на ўрачысты сход, прысвечаны паўвекавому юбілею рэспублікі і Кампартыі Беларусі, сабраліся студэнты і выкладчыкі, рабочыя і служачыя.**

**У прэзідыуме сходу — вядомыя ўсёй краіне вучоныя, актывісты партыйных, камсамольскіх і прафсаюзных арганізацый, выдатнікі вучобы, прадстаўнікі ўрада, партыйных і савецкіх органаў сталіцы.**

**Гучыць музыка, у зале святочны настрой. Урачысты сход адкрывае рэктар універсітэта прафесар А. Н. Сеўчанка. Выконваюцца Гімны Савецкага Саюза і Беларускай ССР. Героі Савецкага Саюза дацэнты А. А. Філімонаў і Д. П. Жмуроўскі ў суправаджэнні асістэнтаў уносяць сцяг БДУ.**

**Слова прадастаўляецца намесніку Старшыні Савета Міністраў БССР Р. Я. Кісялёву. Ён сардэчна віншуе універсітэцкі калектыў са святам і ўручае на вечнае захаванне памятны сцяг ЦК КПБ, Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР, Савета Міністраў БССР і Белсаўпрофа, ад іх імя жадае новых поспехаў і перамог.**

**З дакладам выступіў рэктар А. Н. Сеўчанка. Начальнік вучэбнай часткі В. С. Далгарукаў зачытаў загад рэктарата аб узнагароджанні супрацоўнікаў і студэнтаў.**

**З вялікім уздымам пад бурныя апладысменты сход прыняў пісьмо Цэнтральнаму Камітэту Камуністычнай партыі Савецкага Саюза.**

**Вечар закончыўся вялікім канцэртам.**

# ЦЭНТРАЛЬНАМУ КАМІТЭТУ

## КАМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ САВЕЦКАГА САЮЗА

Урачысты сход прафесарска - выкладчыцкага саставу, аспірантаў, студэнтаў, рабочых і служачых Беларускага ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна, прысвечаны 50-годдзю БССР і Кампартыі Беларусі, ад усяго сэрца дзякуе Цэнтральнаму Камітэту Камуністычнай партыі Савецкага Саюза за бацькоўскія клопаты і велізарнейшую дапамогу беларускаму народу, за вялікую ўвагу і высокую ацэнку працы нашага шматтысячнага калектыву ў падрыхтоўцы і выхаванні актыўных будаўнікоў камунізма, у развіцці навукі.

Наш універсітэт з гонарам носіць імя вялікага Леніна. Вобраз роднага Ільіча — у сэрцы кожнага студэнта, выкладчыка, вучонага. Першасны наш абавязак — паўсядзённа выконваць запаветы правадыра рэвалюцыі, заснавальніка і кіраўніка нашай партыі і дзяржавы, стваральніка непарушнай братняй сям'і народаў Савецкага Саюза.

Вялікі Ленін стаяў ля калыскі беларускай дзяржавы і Кампартыі Беларусі. З яго імем звязана і стварэнне нашага Беларускага дзяржаўнага універсітэта.

Камуністычная партыя Савецкага Саюза і яе баявы атрад — Кампартыя Беларусі, якія заслужылі бязмежную любоў і давер'е працоўных рэспублікі, з першых дзён існавання універсітэта ўдзялялі яму вялікую ўвагу. Дзякуючы гэтаму ён вырас у буйнейшы цэнтр навукі, кузню высокакваліфікаваных кадраў, выхавання нацыянальнай інтэлігенцыі.

У 1921 годзе, калі Цэнтральным Камітэтам партыі быў створан Беларускі універсітэт, у ім працавала толькі 14 прафесараў і 67 іншых навукова - педагагічных работнікаў. Цяпер ва універсітэце 70 дактароў і 354 кандыдаты навук— усяго каля 1000 супрацоўнікаў, а колькасць студэнтаў дасягае 16 тысяч чалавек. За гады сваіго існавання БДУ імя У. І. Леніна падрыхтаваў каля 25 тысяч спецыялістаў, 860 навуковых работнікаў. Сёння нам прыемна адзначыць, што выпускнікі універсітэта паспяхова працуюць на вытворчасці і ў школах, у навукова-даследчых інстытутах, у творчых саюзах, у партыйных, дзяржаўных і грамадскіх органах і арганізацыях. Універсітэт выхаваў вядомых усёй краіне і за яе межамі вучоных, пісьменнікаў, партыйных і дзяржаўных дзеячоў, адыграў вялікую ролю ў развіцці эканомікі і культурным росквіце Беларускай рэспублікі.

(Заканчэнне на 2-й стар.)

# ЗАСЛУЖАНЫЯ ЎЗНАГАРОДЫ

У сувязі з юбілеямі беларускага народа і за дасягнутыя поспехі ў падрыхтоўцы кадраў Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР аб'явіла падзяку і ўзнагародзіла Граматамі рэктара нашага універсітэта акадэміка АН БССР прафесара А. Н. Сеўчанку, сакратара парткома дацэнта Т. Я. Дудараву, прарэктара па навуковай рабоце прафесара Л. В. Валадзько, прарэктара на вучэбнай рабоце члена - карэспандэнта АПН СССР дацэнта С. А. Умрэйку, прарэктара па вучэбнай рабоце дацэнта А. Я. Малышава, прафесара І. М. Лушчыцкага, дэкана геолага-геаграфічнага факультэта дацэнта М. Т. Раманоўскага і загадчыка кафедры эканамічнай геаграфіі СССР дацэнта І. І. Трухана. Падзяка міністэрства аб'яўлена загадчыку кафедры гісторыі КПСС гуманітарных факультэтаў прафесару У. М. Сікорскаму, дэкану матфака А. А. Гусаку і дацэнту філфака І. Я. Навуменку.

*Пераднавагоднія інтэрв'ю*

# ПРЫСУДЖАЕЦЦА ВУЧОНАЯ СТУПЕНЬ...

**Часта гучыць у гэтыя дні традыцыйнае пытанне: «Чым знамянальны адыходзячы год!» Сёння мы задаем яго сакратару вучоных саветаў універсітэта Марыі Аляксееўне Урынёвай.**

**— На днях адбыўся апошні ў гэтым годзе вучоны савет, увазе якога была прадстаўлена доктарская дысертацыя кандыдата гістарычных навук А. М. Мацко на тэму «Дзейнасць Кампартыі Польшчы і Кампартыі Заходняй Беларусі па арганізацыі працоўных мас на барацьбу супраць гнёту буржуазіі і памешчыкаў (1918 — 1938 гг.)». Гэта дзесятая доктарская дысертацыя, абароненая ў нашым універсітэце ў 1968 годзе. Семдзесят пяць навуковых работнікаў, у тым ліку 50 супрацоўнікаў нашага універсітэта, атрымалі ступень кандыдатаў навук.**

**Гэтыя лічбы красамоўна сведчаць аб тых бурных тэмпах развіцця, якія ўласцівы савецкаму ладу жыцця. Толькі за адзін год, толькі ў адной ВНУ 85 спецыялістаў атрымалі вышэйшую кваліфікацыю! Сярод іх людзі розных узростаў— ад сталага да камсамольскага, — розных інтарэсаў, але аднолькава шчаслівага лёсу.**

**Тыповымі з'яўляюцца біяграфіі многіх вучоных. Старэйшае пакаленне, дактары навук — былыя сяляне і рабочыя, удзельнікі грамадзянскай або Айчыннай войнаў, якія маюць вялікі стаж практычнай работы, аўтары многіх навуковых прац. Моладзь — нядаўнія выпускнікі ў большасці нашага універсітэта і нашай аспірантуры, якія зрабілі свае першыя крокі ў навуку яшчэ у студэнцкіх гуртках.**

**Сярод першых — доктар гістарычных навук І. Е. Марчанка, які прайшоў фронт, тройчы паранен, узнагароджан двума ордэнамі Чырвонай Зоркі, аўтар вядомых работ па гісторыі беларускага народа, складальнік першай хрэстаматыі па гісторыі Беларусі, даследчык пасляваеннай гісторыі беларускага рабочага класа.**

**А вось анкетныя даныя доктара эканамічных навук З. З. Дудзіча: беларус, з сялян, рахункавод калгаса «Камінтэрн» Дзяржынскага раёна, памочнік машыніста дэпо Мінск, студэнт рабфака, эканаміст, з аспірантуры З. З. Дудзіч ідзе на фронт у 1941 годзе і ўжо пасля вайны ён—аспірант кафедры палітэканоміі нашага універсітэта. А з 1953 года Захар Захаравіч Дудзіч загадвае кафедрай палітэканоміі ў політэхнічным інстытуце.**

**Менш багаты падзеямі біяграфіі камсамольцаў — кандыдатаў навук, якія нядаўна абаранілі дысертацыі — асістэнта кафедры матэматычнага аналізу Івана Іванавіча Камяка, выкладчыка кафедры радыёвяшчання і тэлебачання журфака Людмілы Фёдараўны Шылавай. Выдатна закончылі універсітэт і паспяхова — аспірантуру, творча працуюць і цяпер.**

**Абаронай дысертацый завяршыліся ў гэтым годзе плённыя даследаванні групы маладых біёлагаў. Сярод іх Н. М. Кручкова, У. Т. Шалатонін, А. П. Астапеня, удзельнік экспедыцый у раёны Атлантычнага акіяна і Сярэдземнага мора, і многія іншыя.**

**Кожная дысертацыя, абароненая ва універсітэце ў гэтым годзе, — гэта цікавае даследаванне па актуальнай тэме, гэта вялікі ўклад у развіццё навукі, гэта гонар усяго універсітэцкага калектыву.**




*Набліжаецца навагодняе свята. Як жа сустра-*

## ГОДАМ!

*кае яго дружная сям'я студэнтаў універсітэта?*

*Адбыліся навагоднія вечары на філалагічным факультэце і факультэце журналістыкі. Фізікі правядуць свой святочны вечар сёння. Матэматыкі і гісторыкі, біёлагі і географы адзначаць свята 28 снежня.*

*Дзіцячы навагодні ранішнік адбудзецца 1 студзеня ў актавай зале галоўнага корпуса. Для маленькіх гасцей падрыхтавана ўжо каля 1250 падарункаў. Малышы атрымаюць іх з рук Дзеда Мароза. Пасля гульняў і танцаў вакол ёлкі дзецям будуць паказаны цікавыя навагоднія мультфільмы.*

## НАС ВІНШУЮЦЬ

Рэктару універсітэта **А. Н. Сеўчанку.**

Калектыў Мінскага ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга станкабудаўнічага завода імя Кастрычніцкай рэвалюцыі горача віншуе асабіста Вас і Ваш калектыў з вялікім святам беларускага народа — 50-годдзем БССР і Кампартыі Беларусі і ўзнагароджаннем Вашага калектыву памятным сцягам ЦК КП Беларусі, Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР, Савета Міністраў БССР, Белсаўпрофа. Жадаем далейшых творчых поспехаў у справе выхавання маладога пакалення і добрага здароўя і вялікага асабістага шчасця.

**Эверсман,** дырэктар завода, **Барташэвіч,** сакратар парткома, **Барханаў,** старшыня заўкома, **Жалнярук,** сакратар камітэта камсамола.

— Якім вы ўяўляеце сабе студэнта 2019 года, г. зн. праз пяцьдзесят год?

— Што вы хацелі б яму пажадаць?

З такімі пытаннямі рэдакцыя звярнулася да юнакоў і дзяўчат з розных факультэтаў. Паступілі дзесяткі адказаў, на першы погляд, вельмі супярэчлівых. Аднак усе сходзяцца на тым, што студэнт праз 50 год істотна зменіцца, праўда, на іх думку, ён возьме ад нашага сучасніка многае: весялосць і бадзёрасць, працавітасць і дапытлівасць. Прычым фізікі лічаць, што большасць студэнтаў 2019 года будзе фізікамі, матэматыкамі, філолагі — філолагамі. Гэтыя вывады цікава абгрунтоўваюцца. Так, В. Далінін і Л. Пергаменшчыкаў пішуць: «Старажытнагрэчаскі мысліцель Дэмакрыт гаварыў, што філасофія дае чалавеку дар добра мысліць, добра гаварыць і добра дзейнічаць, таму і студэнты праз паўвека павінны быць толькі філосафамі». А вось адказ Л. Маслаковай з юрфака: «Студэнт-юрыст у час практыкі расследуе складаную справу. Нехта М. папярэдзіў крушэнне поезда, трэба яго знайсці і вынесці рашэнне. Што яго чакае? Канешне, узнагарода і ўдзячнасць грамадства. Здаецца, што студэнты-юрысты праз 50 год будуць займацца толькі такімі справамі, а суддзі будуць выносіць пастановы аб ...узнагароджанні».

Нельга пералічыць усіх пажаданняў студэнтам 2019 года. Ім жадаюць такіх жа здольных, таленавітых і глыбокачалавечных выкладчыкаў, як нашы, універсітэцкія, не рыхтавацца да залікаў і экзаменаў у апошнюю ноч. Філолагі наогул абагульнілі свае адказы:

Студент останется
студентом
И в пятитысячном году!




# ПЕРШЫЯ КРОКІ

У апошнія перадсвяточныя дні падводзяць вынікі свайго руху наперад і аспіранты гістфака. Для многіх з іх канец 1968 года супадае з завяршэннем першага этапа іх навукова-даследчай дзейнасці. Паспяхова здалі апошнія кандыдацкія экзамены аспіранты другога года навучання З. С. Маслоўскі, В. Ф. Шалькевіч, С. Д. Шаш, В. А. Дудко (кафедра гісторыі філасофіі і логікі), Ж. Кароль (кафедра марксісцка-ленінскай філасофіі), М. Нячай (кафедра палітэканоміі і іншыя. Некаторыя з аспірантаў падрыхтавалі і здалі ў друк свае першыя артыкулы. Асабліва трэба адзначыць, што многія з іх прысвечаны вызначэнню ролі КПБ у развіцці народнай гаспадаркі рэспублікі, пытанням развіцця марксісцка-ленінскай філасофіі ў Беларусі. Тут у першую чаргу трэба адзначыць дысертацыю аспіранта кафедры гісторыі КПСС А. К. Саглаева «Дзейнасць Камуністычнай партыі Беларусі па інтэрнацыянальнаму выхаванню працоўных у перыяд паміж XX і XXII з'ездамі КПСС». Дысертант паспяхова працуе над сваёй тэмай. Выдадзена брашура «Выхаванне працоўных у духу пралетарскага інтэрнацыяналізму — адна з галоўных задач КПСС», а таксама ў часопісах «Партийная жизнь» і «Коммунист Белоруссии» надрукаваны два артыкулы па гэтай жа тэме. Высвятленню дзейнасці КПБ у даны перыяд прысвечана і работа І. С. Кажамякава.

Аб дзейнасці Кампартыі Беларусі ў 50-я гады расказваюць дысертацыі В. В. Матусевіча і В. К. Шыціка. Слаўнаму гістарычнаму мінуламу КПБ прысвячае сваю працу С. А. Пружаноўскі. Шэраг работ раскрывае вялікую ролю Кампартыі рэспублікі ў справе развіцця навукі, падрыхтоўкі навуковых і навукова-педагагічных кадраў БССР. Аспірант кафедры гісторыі філасофіі В. Ф. Шалькевіч даследуе «Развіццё марксісцка-ленінскай філасофіі ў Беларусі ў 1946—1956 гг.». «Развіццё філасофскай думкі ў Беларусі ў перадваенны перыяд (1936—41 гг.)» асвятляе аспірант Я. Вашкевіч.

Паспяхова працуе над сваёй тэмай і аспірант кафедры палітэканоміі А. А. Стуханаў. На матэрыялах Беларусі пішуць свае працы і аспіранты кафедры гісторыі СССР і гісторыі БССР. Гэта ўсё гаворыць аб тым, што маладыя вучоныя гістфака, як і ўсяго універсітэта, уносяць значны ўклад у развіццё навукі нашай рэспублікі.

І. РЭКУЦ,
аспірант.
І. СТАДУБ,
партгрупорг аспірантаў гістфака.



У нашай студэнцкай сям'і святкуе Новы год і слаўныя юбілеі рэспублікі вялікая група в'етнамскіх юнакоў і дзяўчат. З дапамогай сваіх савецкіх сяброў яны паспяхова авалодваюць ведамі, культурна адпачываюць. На здымку нашага фотакарэспандэнта *М. Нічыпарэнкі* вы бачыце хор в'етнамскіх студэнтаў, які выступіў ва універсітэце ў дзень восьмай гадавіны Фронта Нацыянальнага Вызвалення Паўднёвага В'етнама.

# ЯЕ ВЯЛІКАСЦЬ ХІМІЯ

**У 20-я гады Савецкая Беларусь, багатая азёрамі, лясамі і торфам, здавалася, самім лёсам прадназначалася да прамысловай перапрацоўкі менавіта гэтых багаццяў. У тыя часы нельга было прадбачыць цяперашнюю стройную карціну комплексных поспехаў розных галін прамысловасці рэспублікі, якія забяспечылі бурнае развіццё нафтахімічнай вытворчасці. Не выпадкова таму вучоныя-хімікі пэўныя гады паглыблена займаліся пытаннямі хімічнай перапрацоўкі раслінных матэрыялаў і торфу. І толькі з адкрыццём у Беларусі месцазнаходжанняў нафты, пачалі будавацца буйныя нафтахімічныя прадпрыемствы.**

**Дакладная перспектыва росту прамысловай здабычы — ужо да 80-х гадоў здабыча нафты ў БССР не ўступае Баку— намнога аблягчае задачу стварэння гэтых вытворчасцей. Цяпер ужо працуе на нафце хімічны камбінат у Полацку, арганізавана вытворчасць поліэтылену, на чарзе выпуск капралактаму, нітрылу акрылавай кіслаты, нітрону, лаўсану. Будзе ўзведзены буйнейшы завод сажы, гігант шыннай вытворчасці і іншыя.**

**Яе вялікасць хімія, атрымаўшы пастаянную прапіску ў нашай рэспубліцы, патрабавала стварэння сваіх кваліфікаваных кадраў. Кафедра нафтахіміі нашага універсітэта якраз і прызвана рыхтаваць кадры хімікаў для цэхавых, агульназаводскіх і даследчых лабараторый новай галіны. Бясспрэчна, даволі вялікая агульнахімічная падрыхтоўка студэнтаў на першых трох курсах факультэта, будучы ўзмоцнена прафіліруючымі тэхналагічнымі дысцыплінамі, на старшых фарміруе спецыялістаў, якія адразу лёгка арыентуюцца ў запатрабаваннях і задачах адпаведнай вытворчасці.**

**На кафедры паспяхова вядзецца і навукова-даследчая работа ў галіне тэарэтычных асноў нафтахімічнага сінтэзу. Выконваецца таксама заданне адной з вытворчых арганізацый.**

**Невялікі калектыў кафедры, святкуючы знамянальны юбілей рэспублікі, ганарыцца тым, што ўносіць свой пачэсны ўклад у развіццё новай для Беларусі галіны прамысловасці.**

**Д. АНДРЭЕЎСКІ,**
**загадчык кафедры, доктар хімічных навук, прафесар.**

# РАВЕСНІК РЭСПУБЛІКІ



Дзень 1 студзеня 1919 года стаў гістарычным для беларускага народа. У гэты зімовы марозны дзень у маладую сям'ю парабка Станіслава Цішкевіча, якая жыла ў палескай вёсцы Настолле, акружанай хмыззём, вузкімі сялянскімі палоскамі зямлі і ніколі не высыхаючымі балотамі, прыйшла і асабістая радасць: нарадзіўся першы хлопчык. Янка рос, як і ўсе яго аднагодкі, — вельмі рана пачаў пасвіць статак, дапамагаць бацьку і маці ў працы. Усё ішло па векавой традыцыі, але калі хлапчуку споўнілася восем гадоў, яго паслалі ў школу — першую Хойніцкую беларускую сярэднюю школу. Дарэчы, Станіслаў Цішкевіч сам быў малапісьменным чалавекам, а яго жонка не ўмела нават распісацца.

Школа прынесла многа новага не толькі для Янкі, але і ў сям'ю Цішкевічаў. У хаце паявіліся падручнікі, тут часта чыталі кніжкі, якія прынасілі з сельсаветаўскай бібліятэкі. У першыя месяцы калектывізацыі ў Цішкевічаў кватараваў начальнік палітаддзела МТС Каменштэйн. Бальшавік-ленінец, актыўны змагар за народнае шчасце, ён аказаў вялікі ўплыў на хлапчука. Зрэшты, і ўся сям'я прыслухоўвалася да кожнага яго слова. Па яго прапанове Станіслаў уступіў у калгас, дапамагаў сыну ў выкананні «вельмі складаных» спачатку піянерскіх, а затым і камсамольскіх даручэнняў. А сын сапраўды захапляўся грамадскімі справамі, ды і сябра ў яго быў такім жа — Іван Мележ, цяпер вядомы беларускі празаік.

У 1937 годзе паспяхова скончана дзесяцігодка. Куды б падацца? У той час юнакоў асабліва вабілі ваенныя прафесіі. Іван Цішкевіч не быў выключэннем— ён паступае ў авіяцыйнае вучылішча. Усё ішло добра, але праз год захварэў. З жалем ён зняў ваенную форму. Камандзіры даўно прыкмецілі схільнасць курсанта да вучобы, яго выключную дабрату і акуратнасць. Яны параілі Івану Цішкевічу паступіць і Мінскі юрыдычны інстытут. Як паказала далейшае, гэтая парада назаўсёды вызначыла шлях юнака.

Вучыўся камсамолец выдатна. Яму была прызначана імянная стыпендыя. І, канешне, Іван Цішкевіч прымаў актыўны ўдзел у грамадскім жыцці.

...1941 год. Закончаны тры курсы інстытута, застаўся апошні, выпускны. Летам камсамолец паехаў у родныя Хойнікі на вытворчую практыку, працаваў следчым. Там і застала яго вайна. Пытанне, што рабіць, не ўзнікала. Іван Цішкевіч уступае ў рады абаронцаў Радзімы. Аб яго ваенных паходах можна было б напісаць цэлую кнігу, вялікім раздзелам якой стаў бы летапіс службы ў Войску Польскім. За актыўны ўдзел у Вялікай Айчыннай вайне камуніст І. С. Цішкевіч узнагароджан савецкімі і польскімі ордэнамі і медалямі.

Толькі праз 10 год студэнт аднавіў вучобу ў інстытуце. Дыплом выдатніка, рэкамендацыя ў аспірантуру — усё гэта заваявана цяжкай працай, выкананнем свайго доўгу перад Радзімай. У 1953 годзе была абаронена кандыдацкая дысертацыя, а выкладчыцкая дзейнасць пачалася значна раней.

Цяпер Іван Станіслававіч узначальвае кафедру крымінальнага права ў нашым універсітэце. Супрацоўнікі адзываюцца аб ім як аб асабліва сціплым і ветлівым чалавеку, таленавітым даследчыку, здольным выхавацелю моладзі. Аб гэтым жа сведчаць шматлікія граматы рэктарата, прафсаюзных органаў, спартыўныя ўзнагароды і, канешне, надрукаваныя навуковыя працы. Пералік іх заняў бы многа месца, і ўсё ж хочацца прывесці некалькі назваў: «Нарысы па гісторыі дзяржавы і права Беларускай ССР» (у сааўтарстве), «Падрыхтоўка і замах па савецкаму крымінальнаму праву»... А вось да юбілею рэспублікі і свайго пяцідзесяцігоддзя Іван Станіслававіч падрыхтаваў доктарскую дысертацыю. Яна ўжо рэкамендавана да абароны.

Можна было б многае расказаць пра грамадскія справы вучонага. Ён вядомы ў рэспубліцы лектар, ветэран прафсаюзнага актыву універсітэта, кансультант маладых правазнаўцаў — наогул работы хапае.

Гэты кароткі артыкул мне хацелася б закончыць словамі самога Івана Станіслававіча. У яго асабістым лёсе мабыць адлюстраваўся гераічны шлях усяго беларускага народа за апошнія паўвека. «Мне, — заявіў ён, — савецкая ўлада дала ўсё: мажлівасць вучыцца, аддаваць усе свае сілы для народа, развіваць свае здольнасці. Але ж я памятаю, як сялянскія дзеці (і я таксама) хадзілі ў лапцях і палатняных портках. І добра, калі порткі былі пафарбаваны. У першыя гады існавання нашай рэспублікі не хапала самага неабходнага. Паглядзіце цяпер: Беларусь славіцца не толькі сваёй высакаразвітай сельскай гаспадаркай. Я радуюся, што мая праца ўліваецца ў працу маёй квітнеючай Радзімы.

А. ПАЎЛОВІЧ, аспірант.

* * *

НА ЗДЫМКУ: І. С. Цішкевіч у час службы ў Войску Польскім.

# ПЯЮ СВАЮ РАДЗІМУ

*Наш універсітэт даў краіне звыш ста паэтаў, празаікаў, драматургаў. Сярод іх народны паэт Беларусі лаўрэат Ленінскай прэміі Пятрусь Броўка, народны паэт Пятро Глебка, пісьменнікі Кандрат Крапіва, Іван Навуменка і многія іншыя.*
*Ніжэй друкуюцца вершы выпускнікоў універсітэта.*

Максім ЛУЖАНІН

## БЕЛАРУСКАМУ НАРОДУ

Не з імглы курганоў, задрамаўшых над стромай,
Не з паданняў, што вецер стагоддзяў растрос, —
Грозным, свежым і плодным Кастрычніцкім громам
Пачынаецца век наш, гартуецца лёс.
Не раскрой тады свет напалам навальніца,
Цар бы шлях заступаў, страшыў карамі бог.
У краіне другой я не мог бы радзіцца,
Дацягнуцца да сонца ніколі б не змог.
Дужы молат і серп з нашых рук на штандары
Узышлі назаўжды.
Ім няма перашкод.
Вольна ў свеце жыве, ўсім народам таварыш,
Працавіт і вялік беларускі народ.
Поім газаю трактар уласнай гадоўлі,
Нашы нівы ў красе, нашы нетры ў хадзе.
Мой народ!
Ты гаворыш з палёў і будоўляў,
І вышэйшай трыбуны не знойдзеш нідзе.
Не баяўся вайны, не цураюся працы,
Калі трэба—ускіну на плечы ўдвая,
А ў любві да цябе не магу прысягацца
Па той простай прычыне, што ты—гэта я.
Я—твой ранні гудок, шум дубоў на ўзлессі,
Твой каваль, я выкоўваю ў заўтра ключы.
Ты — мой розум і кроў.



ЗІМОВАЯ КАЗКА

Фота Л. Калюжнай.

Пятро МАКАЛЬ

## КАСТРЫЧНІЦКІ ВЕЦЕР

Хаваліся вуліцы ў воблаку
дымным.
Ад самага першага залпу
гармат,
Што з крэйсера слаўнага
Білі па Зімнім,
Зляцела
Апошняе лісце
З прысад...
Яшчэ не былі мы на свеце,
А сцежкі
Для нас вызначаліся ў
грозныя дні.
Святло нашых воч
і шчаслівыя ўсмешкі
Бацькі
Здабывалі тады
У агні.

Ніл ГІЛЕВІЧ.

## ПАСЫЛКА

Прыйшла яна вельмі
дарэчы,
Як зналі бацькі ўсё адно:
Стыпендыя выйшла
да рэшты,
А новай яшчэ не чутно.
Мы сябра гурбой абступілі:
— Давай, ускрывай, брат,
хутчэй!
Не думай, што мы
падружылі
З табою з-за карых вачэй.
Дыхнула са скрыначкі
вёскай.
І тут мы, каб лепшы быў лад,
У госці па звычцы
сяброўскай
Завём аднакурсніц-дзяўчат.
Каштуем каўбасы з-пад
Слуцка
І робім заўвагі свае,
Жартуем, што ўсё ў нас
па-людску,
Бось толькі віна нестае.
Ці думала маці ў раёне,
Складаючы масла ў глячок,
Што будуць удзячны ёй
сёння
Пятнаццаць сыноў і дачок!

Мікола КУСЯНКОЎ.

## НАФТА

*Нафта! Вырас фантан*
*дзівосны*
*Чорным дрэвам, а*
*ў глыбіні—*
*Разышліся па пласце*
*дэвонскім*
*Дрэва дзіўнага карані.*
*Пад зямлёй штуршкамі*
*тугімі*
*Пачынаецца рост яго;*
*Бачу ў завязі нафтахімію*
*Я на голлі дрэва таго.*
*Дасць яно плады*
*незлічоныя...*
*Каб святлеў яшчэ больш*
*мой лёс,*
*Бі фантанамі, нафта чорная,*
*На зямлі, на якой я ўзрос!*

# НАШ ПЕРШЫ ГРОСМАЙСТАР

Цудоўны падарунак юбілею рэспублікі паднёс студэнт трэцяга курса матэматычнага факультэта Анатоль Гантварг — на толькі што закончыўшымся чэмпіянаце краіны па міжнародных шашках Анатоль дабіўся вялікіх поспехаў. Атрымаўшы сем перамог пры адзінаццаці нічыіх, ён разам з чэмпіёнам свету Андрысам Андрэйка (Рыга) падзяліў першае і другое месцы. У канцы студзеня 1969 года паміж імі адбудзецца дадатковы матч з шасці партый за званне чэмпіёна краіны. Аднак незалежна ад выніку паядынку наш студэнт атрымаў права на прысваенне яму высокага звання «Гросмайстар СССР». Ён стане першым гросмайстрам не толькі універсітэта, але і першым гросмайстрам сярод шашыстаў, выхаваных рэспублікай.

Ужо ў чатырнаццаць год Анатоль (цяпер яму 20) звярнуў на сябе ўвагу. Праўда, тады ён іграў у рускія шашкі, і ва ўсесаюзным трэніровачным турніры заняў сярод сваіх равеснікаў другое месца. Хутка ў школьніка паявіліся поспехі і на вялікай дошцы — Анатоль заваёўвае тытул чэмпіёна СССР сярод юнакоў, а затым і сярод юніёраў. Але ж гэта былі дзіцячыя спаборніцтвы. А як ён сыграе з дарослымі?

...XII чэмпіянат СССР, Масква, 1966 год. Юны майстар уваходзіць у дзесятку мацнейшых. Гэты поспех адкрыў яму шлях да міжнародных спаборніцтваў. Іграючы ў другой групе ў галандскім горадзе Хоогезандзе, А. Гантварг прынёс нямала перамог нашым шашыстам.

У мінулым годзе студэнт іграў у Мінску і дабіўся вялікага поспеху — ён стаў бронзавым прызёрам XIII чэмпіянату краіны.

Затым паядынак з гросмайстрам Андрысам Андрэйка за права абараняць гонар краіны на першынстве свету ў Італіі. У кароткім матчы з шасці партый верх узяў больш вопытны, старшы па званню, аднак з мінімальнай перавагай 3,5:2,5 ачка. Але ўрокі гэтага паядынку не прайшлі дарэмна. Яго ігра ў Кіеве на XIV чэмпіянаце СССР пацвердзіла заканамернасць поспеху маладога майстра.

Ад усёй душы віншуем цябе, Анатоль, з выдатным поспехам! З высокім і ганаровым спартыўным тытулам!

Днямі ва універсітэт прыйшла яшчэ адна радасная вестка — трэнеру А. Гантварга старшаму выкладчыку кафедры вылічальнай матэматыкі Генадзю Антонавічу Драбушэвічу прысвоена званне заслужанага трэнера БССР.



НА ЗДЫМКУ: гросмайстар Анатоль Гантварг (злева) у шашачным клубе сталіцы.

Адказны рэдактар М. І. ІОСЬКА.

АТ 00993 Адрас рэдакцыі: г. Мінск, Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, п. 106. Тэлефон: Б-2-07-19. Тыраж 2000 экз. ЗАК. 2198.